УДК 947,6 («1921-1939»)

**В. Гарматны**

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ ПОЛЬСКІХ УЛАД НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921-1939 гг.

*У статті розглядається історіографія аграрної політики польської влади на території Західної Білорусі в 1921 – 1939 рр.*

***Ключові слова**: історіографія, Західна Білорусія, аграрна політика, сільське господарство.*

*В статье рассматривается историография аграрной политики польских властей на территории Западной Беларуси в 1921 – 1939 гг.*

***Ключевые слова**: историография, Западная Беларусь, аграрная политика, сельское хозяйство.*

*Article tells about the historiography of agrarian policy polish authorities on the territory of Western Belarus in 1921 – 1939.*

***Key words**: historiography, Western Belarus, agrarian policy, agriculture.*

Вывучэнне рэалізацыі аграрнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. было і застаецца адным з важнейшых напрамкаў даследавання айчыннай гістарычнай навукі. За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў беларускімі гісторыкамі зроблена значная праца па вывучэнню сацыяльна-эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы ў міжваенны перыяд, у тым ліку і па правядзенні польскімі ўладамі аграрных пераўтварэнняў.

Гістарыяграфія рэалізацыі аграрнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. развівалася ў адным рэчышчы з усёй беларускай гістарычнай навукай, якая ў савецкі час знаходзілася ў падпарадкаваным становішчы ў адносінах да дзяржаўна-партыйнага апарату, паступова атаясамлівалася з дзяржаўнай ідэалогіяй. Сам працэс вывучэння і асвятлення ў гістарыяграфіі і перыядычным друку пытанняў аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі напрамую залежаў ад стаўлення да гэтай праблемы кіраўніцтва савецкай краіны, ад змянення грамадска-палітычнай сітуацыі ў СССР.

Працэс станаўлення і развіцця гістарыяграфіі аграрнай палітыкі польскіх улад на землях Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. можна падзяліць на чатыры асноўныя перыяды:

1) 1921 г. – першая палова 1930-х гадоў. Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы (18 сакавіка 1921 г.) для савецкага кіраўніцтва паўстала задача вырашэння пытання аб Заходняй Беларусі, знаходжанне якой у складзе Польскай дзяржавы лічылася часоваю з\`яваю. Дзеля прапаганды антыпольскіх настрояў сярод мясцовага насельніцтва ўзнікла неабходнасць ідэалагічнага забеспячэння мерапрыемстваў па практычнай рэалізацыі намераў савецкага ўраду, таму ў гэты час усе матэрыялы, якія змяшчаліся ў цэнтральным друку, усе кнігі, прысвечаныя Заходняй Беларусі носяць яскрава акрэслены ідэалагічны характар. Іх мэтаю быў паказ цяжкага сацыяльна-эканамічнага становішча заходнебеларускіх працоўных, зыходзячы з чаго савецкімі дзяржаўцамі неаднаразова выказвалася думка аб неабходнасці як мага хутчэйшага разгортвання рэвалюцыйнага руху заходнебеларускіх працоўных за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне Заходняй Беларусі і ўз\`яднанне яе з БССР.

З цягам часу ўзнікла неабходнасць больш актыўнай і грунтоўнай навуковай працы па вывучэнню гісторыі Заходняй Беларусі і Польшчы навогуле. Гэтыя задачы павінна была вырашыць Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі спачатку пры Прэзідыуме Інбелкульта, потым пры АН БССР, якая выдавала Інфармацыйны бюлетэнь, а таксама створаны ў гэты час Інстытут польскай культуры. Аўтарамі публікацый сталі як прафесійныя гісторыкі, так і тагачасныя актыўныя ўдзельнікі заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. З

гэтымі навуковымі ўстановамі была звязана асноўная навуковая і выдавецкая праца па вывучэнню актуальных праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі.

Даследаванне аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі ў час яго знаходжання ў складзе Другой Рэчы Паспалітай (1921-1939 гг.) пачалося яшчэ ў разглядаемы перыяд. У 1933 г. выйшла ў свет кніга Л. Гака «Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі»[1], у якой аўтар падрабязна разглядае аграрныя пераўтварэнні польскага ўраду, аналізуе заканадаўчыя акты, прынятыя польскім урадам па аграрнай праблеме, падкрэслівае галоўную мэту палітыкі польскіх улад – з дапамогаю вайсковых і цывільных (грамадзянскіх) асаднікаў стварыць сабе моцную сацыяльную апору сярод сялянства Заходняй Беларусі, стварыць тут надзейную прадуктовую базу, забяспечыць ахову мяжы з Савецкім Саюзам.

Л. Гак робіць цікавае параўнанне асаднікаў з казакамі, якіх калісьці царскія ўлады ўзбройвалі і сялілі на памежных землях для аховы іх ад знешніх ворагаў, але на думку аўтара артыкула, гэтае параўнанне не зусім правільнае, бо казакі фарміраваліся стыхійна за кошт збеглых прыгонных сялян, а асадніцтва было мэтанакіраванай палітыкай польскага ўраду, які дасылаў сюды палітычна правераных і надзейных асоб. Аўтар кнігі паказвае асаднікаў з самага негатыўнага боку, адмаўляе іх гаспадарчую кампетэнтнасць, робіць іх «крывавымі прыгнятальнікамі заходнебеларускага сялянства» з не самымі высокімі маральнымі якасцямі, – на думку аўтара артыкула гэтая ацэнка не зусім адпавядае ісціне – асаднікам адводзіліся сельскагаспадарчыя ўгоддзі, якія ў выніку Першай Сусветнай і Савецка-польскай (1919-1921 гг.) войн засталіся без гаспадара, а найм сялян на працу заключаўся па ўзаемнай згодзе, таму даваць інстытуту асадніцтва такую негатыўную ацэнку неправамерна.

Л. Гак піша аб тым, што ў выніку правядзення камасацыі (хутарызацыі) сельскай гаспадаркі сялянам-беднякам заставалася самая горшая зямля, але трэба адзначыць, што польскія ўлады спрабавалі правесці камасацыю мірна і нават дэмакратычна, на тых умовах, якія задавольваюць абсалютную большасць сялян, і замест страчанага селянін атрымоўваў прыкладна раўназначны надзел зямлі. Разам з тым нельга не пагадзіцца з высноваю аўтара, што ліквідацыя сервітутаў праходзіла на тэрыторыі Заходняй Беларусі пераважна прымусова, але неабходна адзначыць, што ў многіх выпадках польскія ўлады давалі сялянам замест скасаванага сервітута кампенсацыю грашыма ці новым надзелам зямлі.

У многім таксама перадузята разглядалася становішча заходнебеларускіх зямель («Крэсаў Усходніх») і ў польскай літаратуры міжваеннага часу. Тагачасных польскіх гісторыкаў (Е. Мейера, К. Сракоўскага, Л. Градзіцкага, В. Яворскага, С. Галасевіча, Л. Васілеўскага, А. Акаловіча, Б. Азміцкага і іншых) больш хвалявала пытанне радыкалізацыі і паступовае апанаванне беларускага нацыянальнага руху камуністамі, а што датычыцца развіцця сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў разглядаемы перыяд, то даследчыкі яўна «прыхарошваюць» аграрную палітыку польскіх улад – нічога не пішуць аб масавым разарэнні дробных сялян, неапраўданай падатковай палітыцы і гэтак далей, паказваюць у асноўным станоўчыя бакі дзяржаўнай палітыкі ў сферы сельскай гаспадаркі, ідэалагічна абгрунтоўваюць знаходжанне заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы і г.д.;

2) Наступны этап даследванняў прыпадае на 1930-я – першую палову 1950-х гадоў. У 1930-я гады ўзмацнілася ідэалагізацыя гістарычных даследаванняў, абсалютызацыя класавых падыходаў – гісторыкі былі пастаўлены пад жорсткі ідэалагічны кантроль Камуністычнай партыі. На вывучэнне разглядаемых праблем сур`ёзны адбітак накладвала грамадска-палітычнае становішча ў краіне, асабліва шматлікія працэсы над ворагамі народу, палітычныя рэпрэсіі. Актыўным чысткам падвяргаліся навукова-даследчыцкія ўстановы, так, у другой палове 1930-х гадоў усе ўстановы, якія займаліся даследаваннем гісторыі Заходняй Беларусі былі ліквідаваны. Усё гэта, а таксама роспуск у 1938 г. Камуністычнай партыі Польшчы і яе складаючай часткі КПЗБ, далучэнне Заходняй Беларусі да БССР у выніку паходу Чырвонай Арміі на захад у верасні 1939 г., спрычынілася да таго, што вывучэнне

[1] Гак, Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / Л. Гак. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Партмассектар, 1933. – 95 с.;

гісторыі Заходняй Беларусі звузілася да канстатацыі ў схематычнай форме прычын, станаўлення і развіцця рэвалюцыйнага руху.

Асаблівы ўсплеск гістарычных даследаванняў, прысвечаных развіццю сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. і навогул гісторыі Заходняй Беларусі, адбыўся ў 1939-1940 гг., але ўсе яны насілі ярка акрэслены «заказны характар»: ідэалагічна абгрунтаваць неабходнасць ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР[2]. У літаратуры канца 1930-х-пачатку 1950-х гадоў пры разглядзе праблем гісторыі сялянства Заходняй Беларусі назіраўся схематызм, перабольшвалася стыхійнасць і рэвалюцыйнасць працоўных масс, падкрэслівалася дзейнасць КПЗБ і г.д.

Сярод выдадзеных у гэты перыяд прац неабходна станоўча адзначыць грунтоўнае даследаванне вядомага гісторыка Л. Гросфельда «Экономический кризис 1929-1933 гг. в Польше»[3], у якім разгледжаны ўплыў сусветнага эканамічнага крызісу на розныя бакі сельскай гаспадаркі тагачаснай Польшчы, паказаны асаблівасці становішча зямель Заходняй Беларусі, прааналізавана падатковая палітыка польскіх улад, якія – на думку аўтара даследавання – за кошт бяднейшага сялянства жадалі знізіць негатыўны ўплыў сусветнага крызісу на эканоміку дзяржавы;

3) Трэці перыяд – другая палова 1950-х гадоў – 1980-я гады – стаў самым плённым і выніковым у развіцці гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі. Рэабілітацыя ў выніку ХХ з`езду КПСС (1956 г.) Кампартыі Польшчы і яе складаючых частак КПЗБ і КПЗУ дала магутны штуршок для даследавання пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі і, ў першую чаргу, гісторыі КПЗБ, гісторыка-партыйная тэматыка стала дамінуючай у навуковай сферы. Дзейнасць КПЗБ і звязаныя з ёю пытанні сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі пачалі ўключацца ў планы навукова-даследчыцкай працы Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Інстытута гісторыі АН БССР, шэрагу кафедр ВНУ рэспублікі. На падставе абароненых кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый было выдадзена шмат манаграфій, навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у перыядычных выданнях і мясцовай прэсе, але пануючая ў краіне ў навуковай сферы падкантрольнасць даследчыкаў дзяржаўным органам значна абмяжоўвала магчымасці гісторыкаў па вывучэнню рэалізацыі аграрнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе Другой Рэчы Паспалітай (1921-1939 гг.).

Вядомы беларускі даследчык А.А. Сарокін прысвяціў сваю працу «Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.)»[4] даследаванню аграрнага пытання ў Заходняй Беларусі ў азначаны перыяд, зрабіў грунтоўны аналіз заканадаўчых актаў аграрнай рэформы і праграм найбольш уплывовых у гэты час палітычных партый, палітыкі польскага ўраду ў галіне сельскай гаспадаркі, падрабязна апісаў становішча тагачаснай вёскі Заходняй Беларусі, яе праблемы і цяжкасці. Аўтар працы ўпершыню ў гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі звярнуў увагу на такую акалічнасць, як напружаныя адносіны паміж многімі асаднікамі і мясцовымі заходнебеларускімі памешчыкамі, якія бачылі ў іх сваіх непасрэдных эканамічных канкурэнтаў.

А.А. Сарокін з'яўляецца таксама аўтарам значнага навуковага даследавання «Освободительное и революционное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920-

---

[2] Гольдштейн, И.И. Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии / И.И. Гольдштейн. – Москва: Государственное социально-экономическое издательство, 1940. – 296 с.; Горбунов, Т. Освобождённая Западная Белоруссия / Т. Горбунов. – Москва: Государственное издательство политической литературы, 1940. – 40 с.; Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – Москва: Государственное издательство политической литературы, 1939. – 40 с.; Западная Украина и Западная Белоруссия – Москва: Наркомпрос РСФСР, Научно-исследовательский институт библиотековедения и рекомендательной библиографии, 1939. – 6 с.; Лочмель, И.Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И.Ф. Лочмель. – Москва: Воениздат, 1940. – 164 с.; Минаев, В. Западная Белоруссия и Западная Украина под гнётом панской Польши / В. Минаев. – Москва: Воениздат, 1939. – 48 с.; Минский, Г. Под игом польских панов / Г. Минский. – Москва: Социально-экономическое издательство, 1939. – 96 с.;

[3] Гросфельд, Л. Экономический кризис 1929-1933 гг. в Польше / Л. Гросфельд. – Москва: Издательство иностранной литературы, 1953. – 128 с.;

[4] Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – 204 с.;

1939 гг.)»[5], у якім падрабязна разгледзеў сялянскі рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі, выкліканы ажыццяўленнем аграрнай палітыкі, але разам з тым Сарокін перабольшваў масавасць і арганізаванасць сялянскага руху, што з'яўляецца асноўным недахопам не толькі названай працы, але і фактычна ўсіх даследванняў, прысвечаным гісторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., выкананых савецкімі гісторыкамі.

У 1970-я гг. выдадзена некалькі зборнікаў дакументаў па гісторыі Заходняй Беларусі і зборнікаў успамінаў былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі («Борьба трудящихся Западной Белоруссии за своё социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР», «Они не стали на колени», «У суровыя гады падполля» і іншыя)[6], у якіх сабраны багаты факталагічны матэрыял па аграрнай гісторыі Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы ў 1921-1939 гг., але гэтыя матэрыялы падабраны вельмі тэндэнцыйна, што прывяло да аднабаковага – адназначна негатыўнага – паказу становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы ў разглядаемы перыяд.

Складальнікі зборнікаў паставілі сваёю мэтаю сабраць дакументы пра масавую і вострую барацьбу сялян Заходняй Беларусі супраць правядзення польскімі ўладамі аграрнай рэформы ў 1921-1939 гг.: насаджэння вайсковага і цывільнага асадніцтва, правядзення парцэляцыі (распродажу ворнай зямлі невялікімі надзеламі – парцэламі), камасацыі (хутарызацыі) сельскай гаспадаркі, прымусовай ліквідацыі сервітутаў (сумеснага землекарыстання сялян і памешчыкаў), таму з-за гэтага навуковая вартасць гэтагых зборнікаў зніжана і сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў азначаны перыяд пададзена фрагментарна, аднабакова і схематычна, у рамках пануючых тады ў гістарычнай навуцы догм пра «антаганістычную класавую барацьбу сялян Заходняй Беларусі супраць сваіх нянавісных, крывавых прыгнятальнікаў – паноў і памешчыкаў».

Развіццю сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі ў азначаны перыяд прысвечана таксама даследаванне Кухарава Я.Б. «Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.)»[7], у якім аўтар шмат увагі адвёў ажыццяўленню аграрнай палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі, паказаў з якімі мэтамі яна праводзілася, прааналізаваў асноўныя яе складаючыя часткі і мерапрыемствы, яе вынікі і значэнне для заходнебеларускага сялянства.

Аўтар працы падрабязна разгледзеў тагачаснае становішча сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі, прынамсі асноўныя пераўтварэнні, праведзеныя польскім ўрадам у аграрнай сферы, склаў на аснове шматлікіх архіўных і дакументальных крыніц падрабязныя статыстычныя табліцы па асноўным пытанням сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёну: маёмасны стан заходнебеларускага сялянства, тэмпы насаджэння асадніцтва і ўзаемаадносіны асаднікаў з мясцовымі сялянамі, ход правядзення парцэляцыі, камасацыі, ліквідацыі сервітутаў і гэтак далей.

У сваіх кнігах «Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.)»[8] і «Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг.» (сумесна з І.В. Палуянам)[9] У.А. Палуян бачыць асноўныя прычыны сялянскага руху Заходняй Беларусі ў тым, што мерапрыемствы польскага ўрада ў

---

[5] Сорокин, А.А. Освободительное и революционное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск: Издательство БГУ имени В. И. Ленина, 1970. – 172 с.;

[6] Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы. В 2 т. – Т. 1. 1921-1929 / В.И. Жигалов (сост.) [и др.]. – Минск: Государственное издательство БССР, 1962. – 620 с.; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы. В 2 т. – Т. 2. 1929-1939 / И.П. Ховратович (сост.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 1972. – 560 с.; У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі [склад.: М.С. Арэхва і інш.] – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – 363 с.;

[7] Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.) / Б.Е. Кухарев. – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.;

[8] Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.) / В.А. Полуян. – Минск: Наука и техника, Институт истории АН БССР, 1978. – 360 с.;

[9] Полуян, В.А., Полуян, И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг. / В.А. Полуян. – Минск: Государственное издательство БССР, 1962. – 224 с.;

аграрнай сферы, як насаджэнне вайсковага і цывільнага асадніцтва (перш за ўсё), правядзенне парцэляцыі (распродажу сялянам часткі памешчыцкіх зямель), камасацыя (хутарызацыя) сялянскіх зямель, пацыфікацыі («уціхамірванне» сялян) і ліцытацыі (распродаж сялянскіх гаспадарак за падатковую запазычанасць з аукцыёнаў), ліквідацыя зямельных сервітутаў (сумеснага зямельнага карыстання) на карысць памешчыкаў і асаднікаў, высокія падаткі, захаванне такіх паўфеадальных перажыткаў, як шарваркі і адпрацоўкі, натуральная аплата сялянскай працы, а таксама прыродныя асаблівасці Заходняй Беларусі (вялікая доля няўжыткаў і багн) прыводзілі да пагаршэння эканамічнага становішча мясцовага насельніцтва, што разам з сацыяльным, палітычным і нацыянальным бяспраўем беларускага сялянства выклікала рэзкае незадавальненне і было падставаю для разгортвання сялянскага і партызанскага руху. Разам з тым У.А. Палуян перабольшвае масавасць і размах барацьбы мясцовага сялянства ў 1921-1939 гг., у выніку чаго ў чытача ствараецца ўражанне, што сялянства Заходняй Беларусі ў гэты час поўнасцю адмоўна адносілася да аграрнай палітыкі польскіх улад, што, безумоўна, не адпавядае рэчаіснасці.

Уплыву сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. на сацыяльна-эканамічнае развіццё зямель Заходняй Беларусі прысвяціў сваё грунтоўнае даследаванне «Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929-1933 гг.»[10] вядомы беларускі гісторык У.А. Палуян, які прывёў дакладныя лічбы спаду памераў сельскагаспадарчай вытворчасці Заходняй Беларусі, паказаў негатыўны ўплыў эканамічнага крызісу на развіццё сельскай гаспадаркі і змяненне рынкаў збыту сельскагаспадарчай прадукцыі, разгледзеў працэс маёмаснай дыферэнцыяцыі заходнебеларускіх сялян.

З другой паловы 1980-х гг. даследаванне рэалізацыі аграрнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. прыкметна запаволілася, што было звязана з агульным метадалагічным крызісам савецкай гістарычнай навукі.

Сярод замежных даследчыкаў гэтага перыяду трэба адзначыць англамоўнага гісторыка І.С. Любашку – эмігранта з Беларусі, які ў сваім даследаванні «Belorussia under Soviet rule. 1917-1957» («Беларусь пад савецкай уладай. 1917-1957»)[11] сцісла разгледзеў у тым ліку і эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., абгрунтаваў неабходнасць ажыццяўлення аграрнай рэформы, асноўныя мэты польскага ўраду ў сферы сельскай гаспадаркі, правядзенне і вынікі аграрных пераўтварэнняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.

4) На новы ўзровень выйшла гістарычная навука Беларусі пасля набыцця краінай дзяржаўнай незалежнасці, яна пазбавілася ідэалагічнага кантролю і ўціску з боку партыйных органаў. З пачатку 1990-х гадоў адбываліся істотныя зрухі ў аграрнай гістарыяграфіі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., якія звязаны з адыходам ад пануючай класавай метадалогіі, увядзеннем у навуковы абарот новых, раней невыкарыстаных архіўных матэрыялаў. Пытанні гісторыі Заходняй Беларусі сталі разглядацца ў кантэксце больш шырокіх тэм – замест пануючага вывучэння нацыянальна-вызваленчага руху і дзейнасці КПЗБ цяпер сталі больш падрабязна і ўсебакова даследавацца пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёну, маёмасны і прававы стан заходнебеларускага сялянства, працэсы яго маёмаснай дыферэнцыяцыі.

Цікавае даследаванне выканаў вядомы беларускі навуковец, доктар гістарычных навук, прафесар Я.С. Паўлаў «Драматычны лёс польскіх асаднікаў»[12], у якім на падставе багатага архіўнага матэрыялу прааналізаваў маёмаснае палажэнне і сацыяльнае паходжанне польскіх вайсковых асаднікаў, па-новаму падыйшоў да характару і вынікаў іх гаспадарчай дзейнасці, паказаў хібы і недакладнасці, пануючыя ў папярэдніх працах даследчыкаў, звярнуў увагу на

---

[10] Полуян, И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929-1933 гг. / И.В. Полуян. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.;

[11] Lubachko, I.S. Belorussia under Soviet rule. 1917-1957 / I.S. Lubachko. – Lexington: The University press of Kentucky, 1972. – 220 p.;

[12] Павлов, Я.С. «Болевые точки» истории Беларуси (из научного наследования) / Я.С. Павлов. – Минск: АРТИ-ФЕКС, 1997. – 252 с.; Паўлаў, Я.С. Драматычны лёс польскіх асаднікаў / Я.С. Паўлаў. // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 47-48;

тое, што пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 г. пры канфіскацыі савецкімі ўладамі маёмасці вайсковых асаднікаў стала ясна, што абсалютная большасць з іх па сваім маёмасным становішчы належала да сялян-серадмякоў.

17-18 верасня 1999 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце адбылася міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Праблемы ўз`яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць». Па яе выніках выдадзены зборнік навуковых артыкулаў[13], у якім асветлены многія дагэтуль малавядомыя старонкі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.

Сярод сучасных беларускіх даследчыкаў аграрнымі пераўтварэннямі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1919-1939 гг. займаецца С.М. Грэсь[14], але ў сваіх высновах даследчык у многім ідзе ў адным напрамку з прадстаўнікамі савецкай гістарыяграфіі: неправамернае выкарыстанне такіх навукова неабгрунтаваных тэрмінаў як «кулак», «сялянская рэвалюцыя» і іншыя ў дачыненні да заходнебеларускай аграрнай гісторыі 1921-1939 гг. не дазваляюць усебакова асвятліць супярэчлівую і складаную гісторыю сялянства Заходняй Беларусі пад уладаю Польшчы, бо ўся аграрная гісторыя Заходняй Беларусі ў разглядаемы перыяд фактычна зводзіцца да антаганістычнай класавай барацьбы сялян супраць памешчыкаў.

Даследваннем актыўнай і даволі паспяховай сацыяльна-эканамічнай, грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці вайсковых асаднікаў на землях Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. займаеццца А.Ф. Вырастка (Сцяпанава). У яе навуковых працах адлюстраваны разнастайныя бакі складанай і супярэчлівай гісторыі заходнебеларускага вайсковага асадніцтва. А.Ф. Вырастка дасканала прааналізавала заканадаўчае афармленне і трансфармацыю палітыкі польскіх улад па насаджэнню ў 1921-1939 гг. вайсковых асаднікаў на землях Заходняй Беларусі[15], паказала доўгачасовы і складаны працэс ўтварэння, станаўлення «Саюза асаднікаў» (ZOS, Zwiazek Ogolny Osadnikow), яго структуру і дзейнасць.

З усіх заходнебеларускіх ваяводств «Саюз асаднікаў» атрымаў найбольшы ўплыў і распаўсюджванне ў 1921-1939 гг. на тэрыторыі Палескага ваяводства, менавіта тут вайсковыя асаднікі вялі найбольш актыўную і паспяховую грамадска-палітычную і культурна-асветніцкую дзейнасць, чым садзейнічалі каланізацыі акрэсленага рэгіёну. Трэба адзначыць, што некаторыя члены і нават мясцовыя кіраўнікі «Саюза асаднікаў» скампраметавалі сябе і саму арганізацыю фінансавымі злоўжываннямі і амаральнымі паводзінамі, чым падрывалі ідэйна-палітычны аўтарытэт арганізацыі сярод саміх асаднікаў і навакольнага сялянства[16].

---

[13] Зялінскі, П.І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919-1939 гг.) / П.І. Зялінскі. // Праблемы ўз`яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 года, Мінск, БДУ. – Мінск: БДУ, 2000. – 332 с. – С. 24-30; Коўкель, І.І. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921-1939 гг.) / І.І. Коўкель. // Праблемы ўз`яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 года, Мінск, БДУ. – Мінск: БДУ, 2000. – 332 с. – С. 16-24;

[14] Грэсь, С.М. Аграрнае пытанне ў праграме асноўных польскіх палітычных партый у 1921-1939 гг. / С.М. Грэсь. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. Гісторыя. Філалогія. – 2005. – № 4. – С. 6-11; Грэсь, С.М. Аграрная палітыка польскай санацыі ў 2-ой палове 20-30-х гадоў ХХ стагоддзя / С.М. Грэсь. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. Гісторыя. Філалогія. – 2004. - № 3. – С. 15-19; Грэсь, С.М. Вынікі аграрных пераўтварэнняў і іх уплыў на стан сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. / С.М. Грэсь. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. Гісторыя. Філалогія. – 2004. – № 4. – С. 15-19; Грэсь, С.М. Насаджэнне асадніцтва на землях Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. / С.М. Грэсь. // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі, супярэчнасці, перспектывы развіцця. Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі 3-4 мая 2002 г., г. Гродна, ГрДУ імя Я. Купалы. У 4 ч. Ч. 4. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2003. – 327 с. – С. 252-257, 309-310; Грэсь, С.М. Палітыка Польшы ў аграрным пытанні ў Заходняй Беларусі / С.М. Грэсь. // Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы: Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі. Мінск, БДУ, 16-17 сакавіка 2001 г. – Мінск: БДУ, 2001. – 210 с. – С. 137-142; Грэсь, С.М. Сялянскі рух у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд (1921-1939 гг.) / С.М. Грэсь. // Гісторыя Беларусі: новае ў выкладанні. Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю БДПУ імя М. Танка. Мінск, БДПУ імя М. Танка, 25 кастрычніка 2002 г. – Выпуск 2. – Мінск: БДПУ, 2002. – 244с. – С. 125-128;

[15] Вырастка, А.Ф. Выпрацоўка заканадаўства аб асадніцтве ў ІІ Рэчы Паспалітай і яго рэалізацыя / А.Ф. Вырастка // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навуковых артыкулаў / Гродна, ГрДУ, 2006. – 422 с. – С. 232-237; Вырастка, А.Ф. Заканадаўчая трансфармацыя і юрыдычнае афармленне палітыкі асадніцтва ў Другой Рэчы Паспалітай у перыяд 1919-1920 гады / А.Ф. Вырастка // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. – 2008. – № 1. – С. 43-48;

[16] Выростка, Е.Ф. Основные направления деятельности «Союза осадников» на территории Полесского воеводства (1921-1939 гг.) / Е.Ф. Выростка // Вести Института современных знаний. – 2008. – № 1. – С. 26-29; Вырастка, А.Ф. Працэсс

Даследчык разгледзела працэс асвятлення і стаўлення айчынных даследчыкаў 1920-1940-х гг. да разглядаемага пытання. На думку тагачасных гісторыкаў «Саюз асаднікаў» з'яўляўся вайсковай арганізацыяй, якой падпарадкоўваліся мясцовыя асаднікі, паводле меркаванняў некаторых айчынных гісторыкаў азначанага перыяду «асадніцкія калоны (калоніі) параўноўваліся з ваеннымі ўмацаваннямі, на якіх пражывалі асаднікі, узброеныя рэвальверамі і вінтоўкамі». У цэлым трэба адзначыць, што стаўленне разглядаемых аўтараў да «Саюза асаднікаў» і саміх асаднікаў было рэзка адмоўным, што абумоўлена ідэалагічнымі прычынамі – у Савецка-польскай вайне асаднікі ваявалі супраць Чырвонай Арміі[17].

А.Ф. Вырастка пераканаўча даказвае, што, нягледзячы на ўсе меры польскага ўраду па падтрымцы вайсковага асадніцтва, некаторыя асаднікі не змаглі арганізаваць і паспяхова весці на землях Заходняй Беларусі асабістую сельскую гаспадарку, своечасова выплачваць патрабуемыя працэнты па атрыманым банкаўскім крэдытам і пераключыцца на іншы від гаспадарчай дзейнасці – часткова такую сітуацыю можна патлумачыць праявамі сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг., які аказаў вялікі негатыўны ўплыў на гаспадарчую дзейнасць заходнебеларускіх вайсковых асаднікаў.

Даследчыца паказвае, што вайсковыя асаднікі ў 1921-1939 гг. вялі актыўную і даволі паспяховую культурна-асветніцкую дзейнасць сярод мясцовага насельніцтва. Неабходна аднак адзначыць, што разам з безумоўным негатывам (асаднікі выступалі перш за ўсё ў ролі каланізатараў), вайсковыя асаднікі ўнеслі ў разглядаемы перыяд значны станоўчы ўклад у павышэнне агульнага культурнага і адукацыйнага ўзроўню заходнебеларускага насельніцтва дзякуючы арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі розных курсаў, і таварыстваў, правядзенню рознага роду выстаў і мерапрыемстваў, стварэнню народных дамоў, школ і бібліятэк. А.Ф. Вырастка падкрэслівае, што значнаю перашкодаю ў культурна-асветніцкай дзейнасці вайсковых асаднікаў сярод заходнебеларускага насельніцтва ў 1920-1930-я гг. стала недастатковая колькасць літаратуры, якая ў асноўным насіла агранамічны і палітычны характар, а таксама састарэлыя перыядычныя выданні[18].

У працах А.А. Цітовай разглядаецца аграрнае пытанне ў праграмах найбольш уплывовых палітычных партый Другой Рэчы Паспалітай, іх стаўленне да ажыццяўлення аграрнай палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі і дзейнасць палітычных лідараў па вырашэнню аграрнага пытання[19]. Трэба асабліва адзначыць артыкул даследчыцы, прысвечаны адносінам заходнебеларускіх саймавых паслоў (дэпутатаў) да пытання заканадаўчага афармлення аграрнай рэформы. Аўтарка падкрэслівае, што прадстаўнікі ад Заходняй Беларусі, перш за ўсё Браніслаў Тарашкевіч, выступалі супраць насаджэння на гэтых землях вайсковых

стварэння і структура арганізацыі "Саюз асаднікаў" / А.Ф. Вырастка // Культура, наука, образование в современном мире: материалы III Международной научной конференции. – Гродно, ГГАУ, 2009. – 290 с. – С. 73-78.

[17] Вырастка, А.Ф. Праблема асадніцтва ў беларускай гістарыяграфіі 20-40-х гг. XX ст. / А.Ф. Вырастка // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, г. Мінск, 28 сакавіка 2008 г. У 2 ч. Ч. 2. Гістарыяграфія новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: даследаванні, праблемы, пошукі / Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка; рэдкалегія А.І. Андарала, М.М. Забаўскі, А.П. Жытко [і інш.]; адказны рэдактар В.А. Пілецкі. – Мінск, БДПУ імя М. Танка, 2008. – 296 с. – С. 65-67;

[18] Вырастка, А.Ф. Сучасныя погляды на культурна-асветніцкую дзейнасць асаднікаў / А.Ф. Вырастка // ЕС и восточнославянский мир (конец XX – начало XXI вв.): материалы Международной научной конференции (Гродно, 19 октября 2006 г.) / ГрГУ им. Я. Купалы [и др.]; под общ. ред. А.Н. Нечухрина; редкол.: А.Н. Нечухрин [и др.]. – Гродно, ГрГУ, 2008. – 239 с. – С. 206-212;

[19] Титова, А.А. Борьба революционного блока польского Сейма за демократическое решение аграрной проблемы во второй половине 1925 г. / А.А. Титова // Советское славяноведение. – 1988. – № 2. – С. 28-35; Титова, А.А. Вопрос об аграрной реформе в польском Сейме в первой половине 1925 г. / А.А. Титова // Вопросы истории. Межведомственный сборник. Выпуск 10. – Минск, Издательство БГУ имени В.И. Ленина, 1983. – 176 с. – С. 30-36; Титова, А.А. Позиції політичних партій Польші при обговоренні законопроекту про аграрну реформу (червень-липень 1925 р.) / А.А. Титова // Проблеми слов'янознавства. Випуск 30. – Львив, Вища школа, 1984. – 120 с. – С. 61-66; Титова, А.А. Позиции польских политических партий в Сейме по вопросу об аграрной реформе (ноябрь 1922 г. – май 1923 г.) / А.А. Титова // Проблемы всеобщей истории. – Москва, МГУ, 1976. – 378 с. – С. 235-246; Титова, А.А. Позиции польских политических партий по вопросу аграрной реформы в 1922-1925 гг.: автореф. дисс. на соискание степени канд. ист. наук / А.А. Титова. – Москва, МГУ, 1977. – 26 с.; Титова, А.А. Позиция Польской Социалистической Партии по вопросу аграрной реформы в 1924-1925 годах / А.А. Титова // Советское славяноведение. – 1984. – № 6. – С. 72-76; Титова, А.А. Проблема аграрной реформы в польском Сейме (июнь-декабрь 1923 г.) / А.А. Титова // Советское славяноведение. – 1984. – № 6. – С. 39-51;

асаднікаў і аказання ім з боку польскіх улад матэрыяльнай дапамогі, але іх меркаванні не былі пачуты большасцю Сейма Другой Рэчы Паспалітай[20].

У калектыўнай манаграфіі «Экономическая мысль Западной Беларуси в 1921-1939 гг.» (пад рэдакцыяй П.Р. Нікіценка)[21] разглядаецца абмеркаванне ў Сейме і перыядычным друку праектаў аграрнай рэформы, паказаны адносіны разнастайных колаў грамадства Другой Рэчы Паспалітай да правядзення аграрнай рэформы ў Заходняй Беларусі.

Цікавую працу, прысвечаную развіццю памешчыцкай гаспадаркі на тэрыторыі Камянеччыны ў 1921-1939 гг., напісала Т.А. Калеснiковіч[22], у якой паказала асноўныя тэндэнцыі развіцця сельскай гаспадаркі азначанага рэгіёну. В. Утгоф[23] апублікавала артыкул, прысвечаны актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці вайсковых асаднікаў на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1921-1939 гг. Аўтарка паказвае, што нягледзячы на тое, што насаджэнне вайсковага асадніцтва было мэтанакіраванаю палітыкай польскіх улад, паміж вайсковымі асаднікамі і мясцовымі органамі ўлады і арганізацыямі, непасрэдна задзейнічанымі ў гэтым працэсе, узнікалі значныя супярэчнасці і нават канфлікты, для вырашэння якіх польскімі ўладамі патрабавалася стварэнне спецыяльных камісій.

Сярод польскіх даследчыкаў неабходна адзначыць Ч. Мадайчыка, аўтара кнігі «Burzuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918-1939)» («Буржуазна-памешчыкая зямельная рэформа ў Польшчы ў 1918-1939»)[24], у якой з пазіцыі марксісцка-ленінскай тэорыі класавай барацьбы разгледжана аграрная палітыка Другой Рэчы Паспалітай. У кнізе грунтоўна прааналізавана сеймавае абмеркаванне і заканадаўчае афармленне аграрнай палітыкі, яе асноўныя складаючыя часткі і галоўныя вынікі, маёмаснае становішча розных слаёў тагачаснага грамадства Другой Рэчы Паспалітай, і найперш за ўсё сялянства.

Вядомы гісторык Ст. Інглот ў «Historia chlopow polskich» («Гісторыі польскіх сялян»)[25] адвёў нямала старонак паказу становішча заходнебеларускага сялянства ў 1921-1939 гг., параўноўваў яго становішча з сялянствам карэннай Польшчы, разгледзеў асноўныя складаючыя часткі польскай аграрнай рэформы, паказаў асаблівасці развіцця заходнебеларускіх зямель у разглядаемы перыяд.

Даследчык Я. Стабняк-Смагажэўская прысвяціла сваю грунтоўную працу «Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945» («Крэсовае вайсковае асадніцтва. 1920-1945 гг.»)[26] дзейнасці польскіх вайсковых асаднікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Цікавасць Стабняк-Смагажэўскай да гэтай тэмы выклікана тым, што яе бацькі самі з'яўляліся вайсковымі асаднікамі з Валыні, таму аўтарка падрабязна прааналізавала на падставе шматлікіх архіўных крыніц колькасны і якасны склад «крэсовых» вайсковых асаднікаў, іх гаспадарчую, палітычную і культурную дзейнасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі, прыявяла шмат новых значных і раней невядомых фактаў з гісторыі вайсковага асадніцтва на землях «Крэсаў Усходніх». Разам з тым Я. Стабняк-Смагажэўская ў некаторай ступені прыхарошвае ўзаемаадносіны сялян і вайсковых асаднікаў, паміж якімі часам адбываліся даволі вострыя канфлікты з-за незадавальняючага сялян пераразмеркавання свабоднай ворнай зямлі.

---

[20] Цітова, А. Беларускі дэпутацкі клуб і праблема аграрнай рэформы ў польскім Сейме ў 1922-1935 гг. / А. Цітова // Беларусіка-Albaruthenika: Кн. 3. Нацыянальныя і рэлігійныя культуры, іх узаемадзеянне. Мінск, Навука і тэхніка, 1994. – 432 с. – С. 269-276;

[21] Экономическая мысль в Западной Беларуси в 1921-1939 гг. / В.Н. Бусько, Б.С. Войтешенко, С.Л. Якименко; под научной редакцией П.Г. Никитенко. – Минск, ИООО «Право и экономика», 2004. – 158 с.;

[22] Калеснiковіч, Т.А. Памешчыцкая гаспадарка на тэрыторыі Камянецкага раёна ў міжваенны перыяд (1921-1939 гг.) / Т.А. Калеснiковіч. // Моладзь Берасцейшчыны: зборнік студэнцкіх навуковых прац. – Брэст: Академия, 2006. – 244 с. – С. 94-99;

[23] Утгоф В. Общественные организации осадников и их деятельность на территории Полесского воеводства (1921-1939 гг.) / Беларусь і Польшча ў ХХ стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі. Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна, 7-8 красавіка 2000 г. – Брэст, Выдавецкі дом С. Лаўрова, 2001. – 239 с. – С. 143-146;

[24] Madajczyk, C. Burzuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918-1939) / C. Madajczyk. – Warszawa, Ksiazka i Wiedza, 1956. – 465 s.;

[25] Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. – Wroclaw: Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 1995. – 395 s.;

[26] Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. –Warszawa: Instytut studiow politycznych PAN oficyna wydawnicza RYTM, 2003. – 431 s.;

Такім чынам, на сучасным этапе развіцця гістарычный навукі сярод польскіх і беларускіх даследчыкаў ідуць вострыя навуковыя дыскусіі наконт эканамічнага становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы. Частка гісторыкаў, імкнучыся разбурыць стэрэатыпы, створаныя савецкімі гісторыкамі аб каланіяльным становішчы Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, даказваюць, што не ўсё было так дрэнна на «Крэсах Усходніх», звяртаюць увагу на тое, што параўнаўчая эканамічная адсталасць зямель Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. (і асабліва Палескага ваяводства) у параўнанні з карэннай Польшчай, выкліканы не столькі эканамічнай палітыкай польскага ўраду, колькі папярэдніх ўладаў. Урадавыя колы Польшчы ставілі задачу уніфікаваць адсталыя ў эканамічных адносінах усходнія ваяводствы і падцягнуць іх да ўзроўню больш развітых цэнтральных і заходніх рэгіёнаў краіны, паставіць сельскую гаспадарку «Крэсаў Усходніх» на аснову капіталістычных адносін.

Падводзячы вынікі трэба адзначыць, што рэалізацыя аграрнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. даволі слаба асветлена ў савецкай, польскай і беларускай гістарыяграфіі. Абумоўлена гэта тым, што польскія гісторыкі ў першую чаргу разглядалі правядзенне аграрнай рэформы на тэрыторыі карэннай Польшчы, а савецкія гісторыкі больш увагі надавалі асвятленню нацыянальна-вызваленчай і рэвалюцыйна-дэмакратычнай барацьбы заходнебеларускага сялянства, таму аграрная гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд пададзена фрагментарна і даволі павярхоўна. Перад сучаснымі беларускімі гісторыкамі стаіць вельмі важная задача – паказаць гісторыю Заходняй Беларусі ў складзе Другой Рэчы Паспалітай з уласна беларускіх нацыянальных пазіцый.

Як адзначыў вядомы польскі даследчык гісторыі «Крэсаў Усходніх» Ян Ежы Мілеўскі: «Многія ацэнкі савецкай гістарыяграфіі патрабуюць пераасэнсавання, бо яны даваліся пад моцным націскам палітыкі. Польшча не была маці для беларусаў, хутчэй яна была мачахай, але і Сталін не быў для БССР бацькам. Перад беларускімі гісторыкамі стаіць вельмі важная задача – даць беларускую нацыянальную ацэнку гісторыі Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы»[27]. Такім чынам, задача даследавання рэалізацыі аграрнай палітыкі польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі 1921-1939 гг. з сучасных навуковых пазіцый застаецца беларускімі і замежнымі гісторыкамі яшчэ пакуль амаль невырашанай.

[27] Милевский, Я.Е. К вопросу о состоянии исследования северо-восточных окраинных земель Второй Польской республики (Западная Белоруссия) / Я.Е. Милевский // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. У 2 ч. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 277 с. – С. 190.